# ДВА КЕШЫ

**Жанна МІУС**

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

*Папулярная пісьменніца Жанна Міус — аўтар кніг для дзяцей «Первоапрельский суп», «Нескучательная дочка», «Малёк Удалёк и Жах-Рыба», «Сиреневая Соня в Чудесонии» і многіх іншых. Маленькія чытачы з нязменным захапленнем сустракаюць яе вершы і вясёлыя гісторыі, насычаныя моўнымі наватворамі. З поспехам стварае пісьменніца і «дарослую» паэзію і прозу.*

*Як бачыцца, асаблівая тэма для Жанны Міус — жыццё братоў нашых меншых. У апавяданні, якое прапануецца на конкурс «Звязды», цікавы паварот сюжэта прымушае паразважаць над узаемасувяззю ўсяго жывога ў гэтым свеце. Што цэментуе адвечную сувязь людзей, жывёл, раслін? Дабрыня, толькі дабрыня...*

**Алена БРАВА.**

Чырвоная зрэнка майскага дня павольна хаваецца пад сваімі аграмаднымі — на паўнеба павекамі: сіне-аблокавым зверху і шыза-хваёвым знізу. У гэты таямнічы, між днём і ноччу, час Кеша спяшаецца выслізнуць з утульнага куточка свайго, каб пабегчы адкрываць яшчэ не спазнаныя ім цікавосткі свету. Гняздзечка яго знаходзіцца ў норцы, а норка — пад коранем старой (у тры абхваты) ліпы, на самым ускрайку Слепчыкава рова — так гэтае вясковае ўрочышча празвалі мясцовыя людзі.

Жыў тут калісьці даўным-даўно адметны чалавек — быў ад нараджэння сляпы. Людзі часам цураюцца незвычайнага, бывае нават, без усялякай падставы палохаюцца і прыдумляюць неверагоднае. Гэткім чынам асоба Слепчыка з цягам часу набыла столькі таямнічасці, колькі неабходна для поўнага адасаблення ад вясковага грамадства. Слепчыку прыплялі стасункі з нячыстай сілай, ім нават сталі палохаць дзяцей. І то — хата на водшыбе, над глыбокім ровам, а побач гусціцца таямнічым змрокам стары ельнік. Калі мужчына памёр, прамінуўшы восьмы дзясятак жыцця, калі хуценька разабралі на дровы яго сціплую хатку, — усё, што звязана з гэтым месцам, стала мясцовай тапанімічнай легендай.

Так што Кеша — не проста вожык, ён — вожык з легенды!

Цікаўны вырас Кеша — спрытны, шэры, чарнаносы, са страката-калючай прычоскай, што расла-расла-расла і разраслася ажно з галавы да самага... мізэрнага хвосточка. Вочкі ў Кешы вільготныя, крыху лупатыя, так і шныраюць па блізкім наваколлі — што б гэта смачнае ўхапіць? То чарвяк дажджавы на кратовай рытвіне зазяваецца, то вусень на лістку задрэмле і ў зубатую вожыкаву пашчу трапіць, то жук прыгожы па галінцы сухой будзе бегчы... «Гам!» — быў жук і няма жука! Наогул жа смакаты ў Слепчыкавым рове хапае, Кеша не галадае. Малечы-жабяняткі, слізкія, масляныя смаўжы, слімакі — якіх толькі далікатэсаў у шчодрай прыроды няма! І ворагаў у вожыка тут, паблізу, не назіраецца, а зайцы і казулі, што сюды часам заглядваюць, на малога калючага вандроўніка — нуль увагі.

Але чагосьці ўсё ж Кешы не ставала. Цягнула ў бок нязведанага. А нязведанае было там — унізе рова, дзе віхляста пракладаў шлях у далеч празрысты ручай, дзе была пратаптаная невядома кім сцежка, дзе пахла таямнічымі істотамі. Драпежнікі? Альбо новыя знаёмыя, магчыма, сябры? Як даведацца аб тым?

Як кажуць, і хочацца, і колецца! Але хацелася болей...

Аднойчы ў прыцемку Кеша забег далекавата ад нары, уздоўж берага ручая. І ў адным месцы, сярод густых зараснікаў сніткі, звярок нечакана натрапіў на пераправу — шырокую драўляную кладку.

«Фр-фрх! Чухсі-чуся! Прабягу! Перакачуся!» — зафыркаў задаволены вожык.

Тэп-тэп-тэп — скок! Перашкода ўзята. Небяспечны ручай булькоча знізу, а цяпер ужо і ззаду.

«Фух-фух-фух, які ж я зух!» — падумаў Кеша. Аднак рана радаваўся: наперадзе чакала новая неспадзяванка: сцежка раптам паднялася ў неба. Падымацца па ёй угору вожыку было нязручна. І ён звярнуў на правы — утравелы — бок. Праз некалькі хвілін і гэтая паласа перашкод была адолена. Толькі захапляльныя спаборніцтвы ніяк не хацелі заканчвацца: перад носам узнік высачэзны — у некалькі вожыкавых ростаў — драўляны плот.

Калі б Кеша быў выхаванцам дзіцячага садка, ён, скрывіўшы маленькія чорныя вусны, прамовіў бы пакрыўджана: «Я так не гуляю!» І, магчыма, пайшоў бы плакаць у куток і сапці ад прыкрасці. Але ён быў упартым звярком, настойлівым у пастаўленай мэце. Пасунуўся спярша налева — плот не можа быць бясконцым, дзесьці будзе праход. Жыццё навучыла Кешу абыходзіць перашкоды, якія б вялікія і жахлівыя яны ні былі. Праход намаляваўся ў выглядзе зламанай жэрдачкі. Вось у гэтую шчарбіну на плоце і праслізнуў цікаўны звярок.

— Гр-р-р! — адразу пачулася над вухам.

Вожык адрэагаваў звыклым для яго спосабам: але-оп! — ператварыў тулава ў колкі клубок і сціснуўся: чакаць і не панікаваць! А тое, што імгненне таму выказвала пагрозу, пачало зацікаўлена таптацца побач: абнюхваць, даследаваць.

«Уй-ю-ю...» — жалобна заскуголіла стварэнне, якое гырчэла.

«Ага!» — падумаў супакоены ў сваім недатыкальным становішчы Кеша.

Вожык высунуў нос і ўбачыў невялікага — усяго ў тры яго росты — звера. Воўк не воўк, ліса не ліса — нешта сярэдняе, хоць падабенства назіраецца: у вушах, вусах і лапах. Звер адышоў убок, пасядзеў, падумаў. Затым вярнуўся і раптам... замахаў прывітальна хвастом. Відаць было: не крыўдуе і мае намер прадоўжыць знаёмства.

Рудавата-рыжы сабака, а гэта, канечне, быў ён, павярнуўся і павёў нечаканага госця да свайго жытла — знаёміць і частаваць. Кеша не стаў чакаць асаблівага запрашэння, затупаў услед. Цікава, чым харчуецца гэты лісавоўк?

Ля сабачага «палаца» — невялічкай драўлянай будкі — стаяла міса з ежай. Але Кеша быў выхаваны вожык. Чаго адразу накідвацца на прысмакі? Так не робяць! Перш-наперш неабходна зазірнуць у гасцінны кут — прыстанішча новага сябра. О! Дык тут таксама маецца гняздо, мяккае, улежнае, з сухой травы. Пахне толькі «фу-фу-фу!» — не вельмі прыемна. Але пах чужога жытла з гасцей хутка выветрываецца. Вожык павярнуўся, зрабіў некалькі маленькіх крокаў і апынуўся ля місы.



О! Малачко! І яшчэ нешта... Невядомае, але ядомае! М-м-м... См-м-мачненькае. Кеша так даўно не каштаваў малака — год, не меней. Таму, не марудзячы, усунуўся ў сабачую міску ледзь не ўсім тулавам. І пачаў хутка, сапучы і фыркаючы, паядаць сабачыя недаедкі: «гам-ням-ням...»

І пайшло з таго часу — ледзь на Слепчыкаў роў падаў змрочны цень захаду сонца, вожык Кеша спяшаецца ў сваю любімую «рэстарацыю». Чарвякоў і жукоў вунь колькі заўгодна навокал — еш ад пузіка. А тут меню адмысловае: то хлеб духмяны, то пячэнька, то макароніна. Гэта для нас — нічога асаблівага, а для дзікага звярка — сапраўдны далікатэс.

Падчас адной гурманскай вячэры Кеша пачуў цяжкія крокі за спінай. Над ім схіліўся белы твар. Вочы, нос, вусны... чагосьці не хапае? А-а-а, дакладна: поўсці! Бяспоўсцевы твар — вось гэта нумар! Раптам побач узнікла лапа, не лапа — не, усё ж лапа, але з доўгімі пальцамі і таксама галаскурая. Лапа пачала гладзіць звярка па калючай спіне.

І тут вожык не стрымаўся: рэзка, незадаволена тузануўся ўбок і выдаў сваё нязменнае «Фр-р... Фух-фух!»

— Ах ты ж! Мой калючык... Кеша! — прамовіла галатварая істота і адняла далонь.

Затым звярок пачуў, што крокі аддаляюцца. Але вялікае Яно не спяшалася ўцякаць, сачыла. Цікавала за ім? Навошта? Можа, любіць вожыкаў... есці? Не падобна — схапіла б адразу. І наогул, як Яно даведалася, што вожыкава імя Кеша? Столькі складаных загадак не памяшчалася ў маленькай галаве.

А сабака — маўклівы вожыкаў сябрук — паводзіў сябе даволі спакойна. Сядзеў побач і жангліраваў зацікаўленым позіркам: то на Кешу гляне, то на жанчыну — гаспадыню сваю.

— Рудзька, які ты ў мяне гасцінны, — азвалася жанчына праз некаторы час.

Яна села на нізенькую, сціплую — у адну сухую рассохлую жэрдачку — лаўку пад акном сваёй будыніны і сашчапіла замком рукі на жываце.

— Малайчына, пёся! Трэба будзе цяпер табе болей ежы класці — на дваіх едакоў. Вось і гаспадарка мая з гэтага часу падрасла. Котка Анфіса будзе мне спяваць вуркотныя песенькі доўгімі зімовымі вечарамі. Ты, Рудзік, — суправаджаць да ручая і ў лес, сцерагчы двор. А вожык Кеша... Гм...

Пажылая жанчына, яе звалі Акцябрына Восіпаўна, задумалася, па твары прабеглі відарысы прыемных успамінаў. Заварушыліся маршчыністыя вусны, загарэліся загадкавыя агеньчыкі ў выцвілых вачах, і ледзь улоўная ружовасць праступіла на шчоках.

На пачатку дзевяностых быў у старэйшай групе, дзе яна працавала памочнікам выхавацеля (па-даўнейшаму — нянечкай), цікавы хлопчык з інтэлігентнай настаўніцкай сям'і — Інакенцій Кожык. На дзіцячай галаве настырна калючыліся жорсткія цёмна-русыя валасы. Даўршалі падабенства з вожыкам маленькія, карыя, крыху лупатыя вачаняты, тоненькія вусны і востранькі доўгі носік.

Не трэба і казаць, што вожыкаватага Кешу імкнуліся пагладзіць па дзівоснай галаве ўсе, каму ў ахвоту: выхавацелькі, повар і дворнічыха іх вясковага дзіцячага садка «Церамок». Нават бацькі іншых дзяцей не саромеліся падыходзіць. Людзі пры гэтым нязменна з усмешкай прамаўлялі: «Кожык — ты сапраўдны вожык!» На што малы Кеша абурана фыркаў, падымаў угору худзенькія празрыста-белыя ручаняты і скідваў, адпіхваў убок чужое, незразумелае і непрыемнае для яго захапленне.

Хлопчык меў не толькі калючы знешні выгляд — душа яго была таксама недатыкальнай, чуллівай. Пакрыўдзіць Кешу і давесці да слязлівай роспачы было справай адной хвіліны: не той дотык, не тое слова, не той позірк — і ў малога пачыналі слязліва расяніцца доўгія цёмныя вейкі. Адным словам, уразлівы недачэпа! Але з Акцябрынай Восіпаўнай, бадай, адзінай у дзіцячым садку ў Кешы атрымалася даверлівае сяброўства. Яна — о цуд! — не гладзіла малога па галаве і вожыкам ніколі не называла. Затое на прагулцы падносіла ў далоні хрушча, які гудзеў, ярка-чырвоную мітуслівую багоўку, пухнатага вусеня ці іншую кузурку. Кеша доўга і ўважліва разглядваў любое жывое стварэнне, а пасля пачынаў задаваць шмат заалагічных пытанняў, адказы на якія не ведала і сама Акцябрына Восіпаўна.

Што ж, дапытлівы Кеша прыходзіў на наступны дзень і распавядаў ёй падрабязна, з дзіцячай крапальнай сур'ёзнасцю, цікавыя рэчы з жыцця насякомых. І сакрэту ў тым не было: маці хлопчыка выкладала біялогію ў мясцовай школе. Нядоўга — два гады. Інакенцій Кожык адпаведна затрымаўся ў «Церамку» толькі на гэты час, не дабыў нават да выпуску. Яго бацькі з'ехалі ў невядомым напрамку, бо іх абавязковая праца па размеркаванні ў глухой, далёкай ад райцэнтра вёсцы скончылася. Хадзілі чуткі, што яны адправіліся на Украіну — бліжэй да родзічаў Кешавай матулі.

Акцябрына Восіпаўна доўга сумавала па гэтым хлопчыку. І ў сне яна часта падымала руку над яго дзіўнай, нязменнай з гадамі прычоскай — хацела пагладзіць, прылашчыць. Але рука, натхнёна ўзляцеўшы ў чуллівым парыве, праз міг застывала... Рука цяжэла, апускалася, так і не выканаўшы жаданы намер...

Ці магчыма было ўявіць, што калісьці ў адзінокай пажылой кабеты з'явіцца свой уласны калючы Кеша?

Лёс чалавечы — ты адмысловы штукар! І прыдумкам тваім няма межаў.

Кеша, трэба сказаць, быў вельмі адказны выхаванец — прыходзіў на вячэрнюю паверку ў час, як мае быць. Падбягаў спярша да ганка, затым да лаўкі, на якой сядзела задуменная гаспадыня, адпускаў некалькі прывітальных фырканняў і паважна вадзіў туды-сюды вострым носам. Нарэшце пасля ўсіх цырымоній накіроўваўся на дэгустацыю — да Рудзькавай місы. Ён цярпліва адносіўся да жадання вялікай істоты абавязкова пагладзіць яго красу і гонар — неверагодную калючую прычоску. Эх, на якія толькі ўступкі не прыходзіцца ісці за смачны пачастунак!

А аднойчы Акцябрына Восіпаўна выйшла на ганак і ўбачыла ля сабачай місы двух вожыкаў. Кеша прывёў сябра? Гм, сяброўку? Сабака ляжаў побач і віхляў неспакойным кудлатым хвастом. А вожыкі без сарамлівых умоўнасцяў наперабой чвякалі, глыталі і фырчэлі ад задавальнення.

...Ружовае вока світання заўзята, з дзіцячым інтарэсам, высочвае-цікуе новы дзень. Падглядвае з-за агромністай шыза-хваёвай лясной павекі хвіліну-дзве — не болей. Затым мяняе эмоцыю і, адпаведна, колер і пачынае дзелавіта перамяшчацца ўверх — на небасхіл: аглядаць, асвятляць, саграваць. Вока штодзённа, безліч гадоў, займае адно пытанне: як тут, пасля няўтульнай цемры, на гэтым напаўсонным свеце, ці ўсё ладна?

— Дзякуй богу, ладна ўсё, — прамаўляе ў адказ Акцябрына Восіпаўна, клыпаючы на свой сціплы гародчык.

Жанчына бярэ ў куточку ля плота матыку і пачынае рыхліць счарсцвелую скарынку зямлі каля востра-колкіх зялёных чубоў цыбулі. Рукі — у руху, а галава занята вярэдлівай думкаю — прыдумаць імя яшчэ аднаму гадаванцу. Та-а-ак, а хто з дзяўчынак у іх «Церамку» таксама вылучаўся «калючым» норавам, недатыкальнай вожыкаватасцю? Трэба пакапацца ва ўспамінах. Нібыта ў цацачным стракатым калейдаскопе, закруціліся ў старэчых вачах маленькія мілыя тварыкі: Верачка Барэйка? Шурачка Шыловіч? Палінка Яхнавец?

Не! Першая, нібы рыжая вяртлявая вавёрка, скакала і караскалася па дзіцячых турніках на пляцоўцы. Другая засяроджанай рабой курачкаю грабла пясок у пясочніцы. А трэцяя, падобная на беленькую, далікатную, вуркатлівую котку, даверліва прыціскалася да Акцябрыны Восіпаўны.

Хіба што Аля? Алька Чубанос! Колкі позірк. Вострынос...